# ДАКУМЕНТАЛЬНАСЦЬ І ЯЕ ВАРЫЯЦЫІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ

***Г. К. Тычко***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*tychko@mail.ru*

У артыкуле аналізуюцца праблемы, звязаныя з жанрава-стылявой адметнасцю дакументальнай літаратуры. Засяроджваецца ўвага на неабходнасці ўдасканальвання катэгарыяльнага апарату, удакладнення шэрагу азначэнняў з улікам іх гістарычнай эвалюцыі. Адзначаецца, што гістарычна ў беларускай літаратуры дакументалізм праявіўся адметна і храналагічна паслядоўна. На прыкладзе твораў сучаснай літаратуры разглядаецца дакументалізм як прынцып мастацкага даследавання рэчаіснасці, вызначаюцца яго тыпалагічныя прыкметы.

***Ключавыя словы:*** дакументальная літаратура; рэальны факт; выдумка; дакумент; жанрава-стылявая адметнасць; новы эпас.

# DOCUMENTALITY AND ITS VARIATIONS IN MODERN BELARUSIAN PROSE

***H. K. Tychko***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: H. K. Tychko (tychko@mail.ru)*

The article analyzes the problems associated with genre and style features of non-fiction literature. Attention is focused on the need to improve the categorical apparatus and to clarify a number of definitions taking into account their historical evolution. It is noted that documentary in Belarusian literature has manifested itself in a peculiar and chronologically consistent manner. Using the example of works of modern literature the author considers documentary as a principle of artistic research of reality and determines its typological features.

***Key words****:* nonfiction literature; real fact; fiction; document; genre and style originality; new epic.

Праблемы, звязаныя з жанрава-стылявой адметнасцю дакументальнай літаратуры, шырока абмяркоўваюцца у сучасным навуковым і мастацкім асяроддзі. Цікавасць да рэальнага факта, імкненне адмежавацца ад «выдуманага», якое робіцца ледзьве не сінонімам «фальшывага», «штучнага», на мяжы ХХ–ХХІ стст. характэрныя для ўсей сусветнай літаратуры і адпавядаюць запатрабаванням сучаснай чытацкай аўдыторыі. Пра гэта сведчыць, у прыватнасці, і сусветны поспех так званых раманаў-галасоў – кніг С. Алексіевіч, мастацкі вопыт якой увянчаны найвышэйшай узнагародай – Нобелеўскай прэміяй.

Разам з тым у сферы дакументальна-мастацкай прозы выразна адчувальны недахоп тэарэтычных ведаў, існуе неабходнасць удасканальвання катэгарыяльнага апарату, удакладнення шэрагу азначэнняў з улікам іх гістарычнай эвалюцыі. Да гэтага часу праблемным застаецца вылучэнне ў тэксце такой прыкметы, як дакументальнасць, яе размежаванне і яе ўзаемадзеянне з аўтарскім вымыслам**.** Дыскусійнымі ўсё яшчэ з’яўляюцца паняцці «мастацка-дакументальныя жанры», «літаратура non-fiction». Традыцыйна *дакументальнае* ўспрымаецца як проза, дзе «даследуюцца гістарычныя падзеі і з’явы грамадскага жыцця шляхам аналізу дакументальных матэрыялаў, прайграваных цалкам, часткова ці ў пераказе. Зводзячы да мінімуму творчы вымысел, дакументальнае своеасабліва выкарыстоўвае мастацкі сінтэз, адбіраючы рэальныя факты, якія самі па сабе валодаюць значнымі сацыяльна-тыповымі ўласцівасцямі» [1, с. 234–235]. Таму невыпадкова з дакументалізмам у літаратуры звязваюцца ў першую чаргу мастацка-дакументальныя жанры (нарысы, мемуары, успаміны і г. д.). Аднак у апошні час падыходы да гэтага паняцця змяняюцца. Так, аналізуючы феномен «літаратуры non-fiction», А. Г. Местэргазі – расійская літаратуразнаўца, чый аўтарытэт у галіне вывучэння дакументалізму ў літаратуры сёння агульнапрызнаны, трактуе дакументалізм як «сучаснае паняцце, якое апісвае творчасць пісьменніка, які так ці інакш працуе ў эстэтыцы дакумента» [2, с. 7].

Гістарычна ў беларускай літаратуры дакументалізм праявіўся надзвычай адметна і храналагічна паслядоўна. Можна прыгадаць як шматлікія прыклады са старажытнай беларускай літаратуры, калі ў XVI і XVII ст. узнікаюць сямейныя хронікі, ствараюцца дыярыушы (дзённікі), падарожныя запісы і іншыя творы мемуарнага жанру, так і больш блізкія творы з гісторыі новай беларускай літаратуры, найбольш значным з якіх, безумоўна, з’яўляюцца славутыя мастацка-дакументальныя запіскі

«На імперыялістычнай вайне» (1914–1919) Максіма Гарэцкага. Можна сказаць, што дакументальна-мастацкія стратэгіі сучаснай беларускай літаратуры пачынаюцца з «міжвольнага і трагічнага» дакументалізму М. Гарэцкага (як называў яго А. Адамовіч) і вядуць да так званага «новага эпасу» самога А. Адамовіча з яго звышзадачай стварэння новай літаратуры – «звышлітаратуры». Заслуга А. Адамовіча не толькі ў тым, што ён адным з першых адчуў запатрабаванасць дакумента ў літаратуры новага часу і тэарэтычна абгрунтаваў сваю гіпотэзу, але і ў тым, што гэту тэорыю ён практычна апрабіраваў у кнігах «Карнікі», «Я з вогненнай вёскі» (у суаўтарстве з Я. Брылём і У. Калеснікам), «Блакадная кніга» (у суаўтарстве з Д. Граніным).

Бясспрэчна, што дакументалізм як прынцып мастацкага даследавання рэчаіснасці валодае шэрагам тыпалагічных прыкмет, спецыфіка якіх выцякае перш за ўсё з неабходнасці сведчання. Менавіта гэтая якасць вызначае дамінатную пазіцыю дакумента як прыёму ў згаданых творах А. Адамовіча, а таксама ў тэкстах іншых аўтараў, такіх як гістарычныя апавяданні, ваенная проза, біяграфічныя і мемуарныя матэрыялы. Аднак разглядаючы прыроду мастацкага і дакументальнага, выдуманага і рэальнаага, штучнага і жыццёвага, важна ўлічваць канцэпцыю стваральніка мастацкага твора. У Нобелеўскай лекцыі Святлана Алексіевіч згадвае словы А. Адамовіча аб тым, «што пісаць прозу пра жахі XX ст. кашчунна. Тут нельга выдумваць. Праўду трэба даваць, як яна ёсць. Патрабуецца звышлітаратура. Гаварыць павінен сведка». І побач яна тлумачыць свой мастакоўскі падыход да ўзнаўлення дакументальнай рэчаіснасці. «Я чалавек – вуха. Калі я іду па вуліцы, і да мяне прарываюцца нейкія словы, сказы, воклічы, заўсёды думаю: колькі ж раманаў бясследна знікаюць у часе. У цемры. Ёсць тая частка чалавечага жыцця – размоўная, якую нам не атрымліваецца адваяваць для літаратуры», – адзначае пісьменніца [3]. Аналізуючы мастацка-эстэтычную прыроду творчасці С. Алексіевіч, прафесар Л. Д. Сінькова адзначае, што «жанр *галасоў* спачатку парасткам праглядваўся ў розных кантамінацыях дакументальнага, публіцыстычнага і мастацкага», аднак, падкрэслівае даследчыца, С. Алексіевіч, адштурхоўваючыся ад журналісцкіх стратэгій, «сустварае чужое маўленне з аўтэнтычных маналагічных плыняў. Такім чынам, не літаральная стэнаграма, а своеасаблівы дакументальна-мастацкі магістрал: запіс выбраных, яскравых, ужо мастацкіх вобразаў-фактаў, унікальных, як усякае сведчанне рэальнага чалавека, і шматзначных, як усякі вобраз» [4, с. 42].

Падкрэсліваючы неабходнасць удакладнення і карэляцыі самога тэрміна «дакументальна-мастацкая проза», Л. Д. Сінькова прапануе ўласную класіфікацыю дакументальна-мастацкіх тэкстаў з падзелам на дзве плыні: 1) прозу fiction («прыдуманую» мастацкую), у якой дамінуе мастацкі вымысел (і дапускаецца імітацыя, містыфікацыя фактаў) і 2) прозу non-fiction («непрыдуманую»), у якой дамінуе фактаграфічная аснова [4, с. 78]. Сваю класіфікацыю даследчыца называе «аказіянальнай», тым самым падкрэсліваючы яе ўмоўнасць і незавершанасць. Аналізуючы велізарны корпус тэкстаў, да прозы fiction яна адносіць такія разнародныя і рознаўзроўневыя тэксты, як трылогія «На ростанях» Я. Коласа, аповесць «Муштук і папка» Я. Брыля, эсэ «Загадка Багдановіча» М. Стральцова, раманы «Рэвізія» А. Федарэнкі, «Літоўскі воўк» А. Наварыча, «Гасцініца Бельгія» Г. Севярынец, нарыс «Зямля пад белымі крыламі» У. Караткевіча і інш. Да прозы non-fiction залічваюцца мемуары, запісаныя прафесійнымі пісьменнікамі, мастацкая публіцыстыка, так званая магнітафонная літаратура А. Адамовіча і творы з цытаваннем дакументаў, такія як «Свой дом» Г. Далідовіча, «Пляц Волі» А. Пашкевіча, жанр галасоў С. Алексіевіч. Канешне, ёсць свая логіка і пераканаўчая доказнасць падобнага падыходу. Разам з тым даследаванне дакументальнага як сукупнасці факталагічнага матэрыялу і ўласнага аўтарскага разумення гістарычных з'яў і падзей – надзвычай складаны аспект вывучэння літаратурнага твора, светапоглядных установак пісьменніка. Галоўная скіраванасць сучасных кніг з дакументальнай асновай – імкненне не столькі асэнсаваць гістарычныя падзеі, колькі зразумець псіхалогію паводзін чалавека на скразняках айчыннай гісторыі.

Рускі вучоны В. Халізеў, згадваючы крайнасць, якая існавала на пачатку ХХ ст., калі выдумка часам расцэньвалася як нешта састарэлае, што адмаўлялася ў імя аднаўлення рэальнага, дакументальна пацверджанага факта, даказвае, што «літаратура нашага стагоддзя – як і раней – шырока абапіраецца і на выдумку, і на нявыдуманыя падзеі і асобы. Пры гэтым адмова ад выдумкі ў імя следавання праўдзе факта ў шэрагу выпадкаў апраўданая і плённая, наўрад ці можа стаць магістраллю мастацкай творчасці: без апоры на выдуманыя вобразы мастацтва і, у прыватнасці літаратуру, нельга ўявіць <...>. Пасродкам выдумкі аўтар абагульняе факты рэальнасці, увасабляе свой погляд на свет, дэманструе сваю творчую энергію» [5, с. 93–94]. Як паказвае практыка, здараецца, што межы паміж мастацкімі і дакументальна-інфармацыйнымі творамі – вельмі расплывістыя. Менавіта выдумка

становіцца крытэрыем іх размежавання: дакументальныя тэксты выключаюць саму магчымасць выдумкі, а творы, якія прэтэндуюць на мастацкасць, ахвотна яе дапускаюць (і ў тых выпадках, калі аўтары абмяжоўваюцца ўзнаўленнем сапраўдных фактаў, падзей асоб). «Паведамленні ў мастацкіх тэкстах знаходзяцца як бы па той бок праўды і хлусні. Пры гэтым феномен мастацкасці можа ўзнікаць і пры ўспрыманні тэксту, створанага з устаноўкай на дакументальнасць», – перакананы В. Халізеў [5, с. 94]. Творчая фантазія сапраўднага мастака ва ўсіх праявах узнаўляемага ім быцця імкнецца спасцігнуць так званую праўду жыцця. Гэтым у многім тлумачыцца зварот сучаснай літаратуры да рэальнага дакументальна пацверджанага факта. Аднак створаны аўтарам свет мастацкага твора апрача жыццепадабенства не можа не ўтрымліваць вялікага пласта ўмоўнасці: свядома скарочанага або свядома пашыранага адлюстравання пэўнага ракурсу рэчаіснасці ў адпаведнасці з аўтарскімі светапоглядными ўстаноўкамі.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Муравьев В. С.* Документальное // Литературная энциклопедия терминов и понятий / сост. и ред. А. Н. Николюкин; Институт научн. информации по общественным наукам РАН.  М.: НПК «Интелвак», 2003. С. 234–235.
2. *Местергази Е. Г.* Литература нон-фикшн / non-fiction: экспериментальная энциклопедия. М.: Совпадение, 2007. 325 с.
3. Нобелевская лекция Светланы Алексиевич [Электронный ресурс]. URL: https://www.nobelprize.org/uploads/2018/06/alexievich-lecture_ry-4.pdf (дата обращения: 08.01 2022).
4. *Сінькова Л. Д.* Беларуская «звышлітаратура»: Літаратуразнаўчыя і літаратурна-крытычныя артыкулы. Мінск: Кнігазбор, 2019. 224 с.
5. *Хализев В. Е.* Теория литературы. М.: Высшая школа, 1999. 240 с.